

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

№ 4 (246) САКАВІК 2018 ГОДА

БЕЛАРУСКІЯ АФАРЫЗМЫ

Святлы баяцца цёмныя краты. Арлы да сонца ведаюць дарогу

Рыгор Барадулін

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

ДЕРЕВНЯ ВЗВЫЛА ВОЛКОМ

В Городокском районе серые хищники приучили сельчан к вилам и топорам — пишет «Республіка».

Начтотольконепойдешьрадилюбимой работы! Даже отправившись в деревню, где встреча с волком — не редкость. «Всех собак съели. Обгладывают прямо на цепи», — встревожены сельчане отдаленных деревень Городокского района. Одни объясняют небывалую активность зверя отсутствием пищи в лесах. Другие пеняют на российских волков. Для зверя ведь границ не существует. Наши охотники добудут его здесь, а на его место приходят другие. В попытках найти волка корреспондент «Рэспубліки» объехала с десяток деревень Городокщины.

Все оттенки «серого»

Из Минска до Витебска — на поезде. До Городка — на маршрутке. Восемь часов спустя я в райцентре. Небольшая заминка: автобусы ходят дважды в день. Утренние рейсы уже уехали, вечерний ждать — день потерять. Подвезти меня согласился водитель «хлебной» машины, которая развозит свежую выпечку по деревням района.

Охотник с более чем сорокалетним стажем Михаил БАРАНОВ хорошо изучил повадки серого хищника

- О-о-о-о… — затянул водитель, оценочно смерив взглядом мой «прикид». — Не по погоде оделись. У нас тут не лето!

— Самое теплое, что было в шкафу, — оправдываюсь, а про себя думаю: «Ох уж эти мужчины…»

По ступенькам взбираюсь в кабину. Трогаем. Не успеваем далеко отъехать за город, как на дорогу выскакивают три косули. Только дернулась за фотоаппаратом, а их и след простыл.

— Да, живности в ваших лесах полно! — мыслю вслух.

В отличие от меня водитель на неожиданную встречу реагирует спокойно, видимо, не впервой:

— Утром дорогу только расчистят и посыплют, так они (косули) тут как тут. Соль любят. Подъезжаешь — они ать в лес и ушками стригут. Только отъедешь, снова показываются.

Первая остановка на маршруте — городской поселок Езерище. У магазина уже стоят сельчане. Ждут свежий хлеб. Пока водитель выгружается, достаю людей расспросами.

— Ходят там, около фермы за поворотом на Студенку, — показывает рукой направление местный завмаг Ирина Лахина. — Видно, телят чувствуют. И даже в деревне ходят. Люди видели, как волки переходили железную дорогу. Дочка нашей Тани (имеет в виду сотрудницу магазина. — Прим. авт.) ходит на танцы в местный клуб. Таня спать не ложится, пока дочь домой не вернется. Ходит встречать. Боимся за детей. Вы лучше в Гурки поезжайте. В интернете читали, там столько собак заели. У меня мама в Гурках живет. Одна на краю деревни. Говорю, мама никуда не выходи, страшно. «Волчья» проблема в окрестных деревнях существует давно. По воспоминаниям Ирины, лет десять назад волки загрызли ее собаку: «Нашли на болоте на следующий день. Лапки, хвостик и ошейник». Причем дело было вовсе не зимой, вроде по осени. А Ирина до сих пор помнит волчьи следы, четко отпечатавшиеся в грязи у болотца за домом…

Такая ситуация в горпоселке Езерище, который находится на оживленной трассе Гомель—Санкт-Петербург. Чего уж говорить о маленьких деревушках! Едем в те самые Гурки.

Вот где собака зарыта

— Это все, что осталось… — показывает на телефоне фото мертвой соседской собаки сельчанка Наталья Соболева.

Иду к владельцам той самой загрязненной собаки, жуткие снимки которой гуляют по всему интернету. Сельчане объясняют дорогу:

Флажки смотаны в катушки и отсортированы по метражу. Ими офлаживают территорию при охоте на волка.

— Вунь там, за желтым домом, поворот направо, по тропинке через лесок и прямо к дому выйдете.

Хм, по тропинке через лесок? Пожалуй, я пас. Несколько минут стою в нерешительности, будто пловец, собирающийся броситься в ледяную воду. Наконец, достав из сумки перцовый баллончик, мчу по той самой тропинке. Все вокруг вдоль и поперек истоптано следами животных. Волчьих вроде не видно. Хотя какой из меня специалист?

— У нас две собаки было. Одну сразу съели, а вторую через неделю, — встречает меня на крыльце хозяйка дома Наталья Белая.

Первым ночную схватку с волком проиграл Дозор. «Кто так безжалостно расправился с собакой?», — первое, что подумала женщина, когда увидела останки.

— Утром вышли покормить собаку, а будка пустая. Сначала подумали, с

(працяг на стар. 2)

ПРАВАПАРАДАК

ЗЛАЧЫНЦЫ КІНУЛІ ПРАВААХОЎНІКАМ ДЗЁРЗКІ ВЫКЛІК

На ўскрайку Гарадка знаходзіцца невялікі магазін "Родны кут", які належыць райпо. Менавіта ён стаў аб'ектам злачынных замахаў: зламыснікі разбілі акно і выкралі грошы і матэрыяльныя каштоўнасці.

Такія крадзяжу часам адбываюцца ў аддаленых вёсках з прычыны слабой абароненасці гандлёвых кропак ад пранікнення старонніх асоб. Аднак у нашым выпадку нехта наўмысна здзейсніў злачынны намер, ведаючы, што аб'ект абсталяваны сігналізацыяй і ёсць толькі лічаныя хвіліны да прыезду групы затрымання аддзялення па ахове аб'ектаў Гарадка Кастрычніцкага аддзела Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь.

- Да нас на пульт каля 1.30 паступіў сігнал трывогі, і праз пару хвілін група ўжо была на месцы здарэння, - сказаў начальнік аддзялення Анатоль Кастрыцкі - Выявіўшы разбітае шкло, супрацоўнікі выклікалі следча-аператыўную групу і прыступілі да пошуку вінаватых.

- У нас наладжана цеснае ўзаемадзеянне з аддзяленнем аховы. Таму я, будучы ў тую ноч дзяжурным па райаддзеле, не чакаючы пацвярджэння аб здзяйсненні злачынства, аддаў загад следча-аператыўнай групе выехаць туды, - паведаміў першы намеснік начальніка Гарадоцкага РАУС Аляксей Макаранка.

Аднак, нягледзячы на аператыўнасць і прыцягненне службовай сабакі, знайсці зламыснікаў па гарачых слядах не ўдалося. Былі задзейнічаны супрацоўнікі АДАІ і іншых службаў, але зладзні як быццам бы раствараліся.

- Парушальнікам згуляла на руку тая акалічнасць, што па найбліжэйшых вуліцах прайшла снегаўборачная тэхніка, і сабака не змагла далей ісці па следзе, - сказаў Аляксей Аляксандравіч.

- Прадстаўнікі райпо, якія прыбылі, растлумачылі, што з крамы выкрадзеныя 120 руб. і чатыры бутэлькі гарэлкі.

Але праца міліцыянтаў не прапала дарма: прачэсваючы мясцовасць, яны знайшлі адну з выкрадзеных бутэлек, страчаную злодзеямі ў спешцы. Гэта дазволіла звузіць раён пошуку. Але так як там размяшчаліся прыватныя дамы, гаспадары якіх спалі, апытанне верагодных сведак вырашылі правесці з раніцы.

- Неўзабаве аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы прынеслі свой плён, і трое падазраваных, раней неадназразова судзімых, былі затрыманыя. На кон быў пастаўлены наш гонар, і мы не пасарамаціліі мундзіра, - паведаміў Аляксей Макаранка.

- Асаблівую ролю ў гэтым адыгралі оперупаўнаважаны крымінальнага вышуку Міхаіл Гвоздзеў і працаваўшы разам з ім курсант акадэміі МУС Андрэй Іваноў, супрацоўнікі аддзялення аховы: міліцыянер групы затрымання Аляксандр Філімонаў і міліцыянер-вадзіцель Сяргей Пракоф'еў.

- Гэта яшчэ раз даказвае, што заключэнне дамовы з Дэпартаментам аховы гарантуе захаванасць маёмасці і эканамічна сябе апраўдвае, - сказаў Анатоль Кастрыцкі.

- Уявіце, калі б на момант крадзяжу магазін не быў абсталяваны сігналізацыяй. За ноч злачынцы спакойна вынеслі б з яго ўсё каштоўнае, і не факт, што потым на іх след змаглі б выйсці аператыўнікі.

"Віцебскія весці" пераклад рэдакцыі

КУЛЬТУРА

ЛАЎРЭАТЫ АГЛЯДА-КОНКУРСА

Лаўрэатамі І ступені на XII абласным аглядзе-конкурсе «Ад прашчураў — да зор» сталі ўдзельнікі з Гарадоцкага раёна.

І зноў Гарадоччына лідыруе ў фальклорным накірунку. Адразу два Лаўрэата І ступені атрымалі нашы удзельнікі на XII абласным аглядзе-конкурсе фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі «Ад прашчураў — да зор» 2 сакавіка у г.п. Расоны.

Першымі ў турніры пар-выканаўцаў беларускіх народных побытовых танцаў сярод 24 пар удзельнікаў лідыравалі Жэлтоўскі Ягор і Раманоўская Аліса з фальклорнага танцавальнага калектыва (кіраўнік Таццяна Лаўрэнава) Езярышчанскага ГпДК.

Другі ў конкурсе музычных інструментальных капэл (ансамбляў) традыцыйнага складу — фальклорны ансамбль «Вязынка» (кіраўнік Жанна Комава) Езярышчанскага філіяла Гарадоцкай дзіцячай школы мастацтваў.

Лілія Рэзкіна
http://gorodok.vitebsk-region.gov.by

Аб’ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з’яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

****

Наша газета "Гасцінец" пачала размяшчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле "Газета "Гасцінец", дзе стварэацца архіў за мінулыя гады.

****

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

(пачатак на стар. №1)

цепи сорвался и по деревне бегает. А дня через два муж в полукилометре от дома нашел порванную цепь и клочки шерсти, — хозяйка показывает ошейник, на котором видны следы крови. — Через неделю и вторую собаку съели. Объели прямо на цепи. Ни визга, ни лая — ничего не слышали. А утром пришли знакомые и говорят: «Вашего Дика волки съели». Так и лежал полусъеденный возле будки до утра.

Серые разбойники и не думают отступать, едва ли не каждую ночь терроризируют семью Белых, живущую на окраине деревни. Слыша добычу, шастают возле сарая.

Обхожу дом Белых по кругу. Следов не видно — запорошило снегом. Замечаю у входа в дом вилы. Вопросительно смотрю на Наталью.

— Я через этот лесок, — Наталья кивает в сторону той самой тропинки, по которой я бежала во весь дух, — каждое утро веду Владика (сына) к остановке школьного автобуса. Вот муж вилы и поставил. Говорит: «Отбивайся, если что». Но я их не беру. Фонарик только — и все. На людей ведь пока не нападали. Забегая немного наперед, скажу, Дик и Дозор стали не единственными жертвами хищника. В окрестных селах волки загрызли несколько десятков собак. Уцелевших хозяева запирают в хлевах или забирают в дома.

Неохота на волка

Спустя полчаса я уже бреду по скрипучему снегу деревни Марченки. Сразу настораживает непривычная для села тишина. Обычно едешь по главной улице — у каждой хаты собака тебя облает. А тут тихо…

— Много тут у вас собак съели? — любопытствую у первого встретившегося на дороге сельчанина.

— Міхайлаў, Логінаў… — незнакомец начинает загибать пальцы на руке. — Шасцярых, атрымоўваецца. Гэты год яны (волки) нейкія азлобленыя сталі. Не стала кабана, дык сабак пачалі тырыць.

Спрашиваю, как отличить волчий след от собачьего.

— След у ваўка прадаўгаваты, а ў сабакі акруглы, во такі, — для наглядности имитирует ладонью волчий след на снегу.

— В России недалеко от границы построили свинокомплекс. Может, они там шкуры какие выбрасывают или дохлятину. Вот волки тут и крутятся, чуют запахи, — подъезжает к нам на «Ниве» местный охотник с более чем сорокалетним стажем Михаил Баранов. — Почему на волка не хожу? Да потому, что в России за добытого волка тысяч 12—13 дают, а у нас — ничего. А сколько сил уходит на охоту! Это ж надо лицензию получить, территорию офлажить, с погодой подгадать. И не факт, что добудешь. Намотаешь километров сто по лесу, да без толку. Волк ведь за день километров 70 может пробежать…

Спасение рядового Алдана

Михаил Баранов и сам недавно отбил свою собаку у волка. Предлагает поехать к нему, познакомиться со счастливчиком по кличке Алдан. Только подходим к дому — раздается радостный лай по ту сторону забора. Алдан, пританцовывая, ластится к хозяину, преисполненный благодарности за спасение. Алдану повезло: его хозяин не из робкого десятка.

— Алдашка, — одобрительно похлопав пса по спине, Михаил Николаевич начинает рассказ. — Вон из тех кустов пришли (указал глазами в сторону леса. — Авт.). За ошейник тянули вместе с будкой. Представляете, какая у них силища! А было это по осени. Проснулся в полпятого утра от жалобного визга и сразу на улицу. Смотрю, а там клубок по двору катается. Мой Алдаша с волком сцепился. Я как закричу — и к ним. Волк испугался — и скорей в лес.

В той схватке Алдан отделался лишь испугом. Поранить его волки не успели. С тех пор Михаил Николаевич смастерил собаке специальную металлическую дверцу на будке и запирает его на ночь внутри.

Сама виновата

Охотников в округе полно. Как любителей, так и профессионалов. Алексея Блинова из деревни Рудня смело можно отнести ко вторым. Захожу в его охотничий домик и сразу впечатляюсь. Внутри на стенах полно памятных фотографий с трофеями. На одной из них запечатлен самый крупный добытый охотниками волк. Чемпионство, кстати, устанавливается не по длине туловища, как я наивно полагала, а по размерам черепа животного.

— 2011 год, — заметив мой интерес, Алексей Блинов поясняет, когда была сделана фотография.

Проблема с волками, по словам Алексея Борисовича, в Рудне обострилась в последние полгода:

— У самого прошлым летом собаку съели. Кобель старый был, сколько волков перевидал вместе со мной на охоте и все равно не спасся.

Местных собак терроризируют три волка. Два серых ходят парой, и еще заходит старый волк-одиночка. Охотники пытались в этом году их флажить (один из способов охоты на волка с использованием флажков. — Авт.). Но серые ушли по льду через речку. А под весом охотников лед трещит, хищники слышат шум и уходят.

Печурка захлебывается жарким пламенем, на стенах висят чьи-то рога и даже шкура волка — антураж, соответствующий охотничьему домику. Замечаю в углу катушки с красными и оранжевыми флажками, отсортированными по метражу. Те самые, которыми офлаживают территорию.

— Идеальный загон для волка — пять километров. Вообще волк — зверь очень осторожный. Весь интерес охоты состоит в том, чтобы его обмануть. Сегодня приезжают друзья из Минска. Будем охотиться на «вабу», — заметив мой несведущий взгляд, охотник объясняет: — Ваба — это подвывка волков, чтобы определить местопребывание и численность волчьего выводка. Бывает, отзываются, а бывает, приходят молча.

О хитрости волка легенды ходят неспроста. И вот почему. Один местный житель обнес дом металлической сеткой, чтобы защитить собаку от диких собратьев. Пришли волки и стали выманивать суку, якобы для случки. Та сама сделала подкоп под сеткой и вылезла к хищникам, которые вмиг с ней расправились.

На коротком поводке

Смеркалось. Заночевать решаю в деревне Газьба, о которой писала в прошлом году. Шума тогда этот текст наделал немало.

— В этом году полегче стало, — узнает меня местный завмаг Марина Данилова. — Наших собак доели, теперь пошли в другие деревни. Сейчас возле Межи, Ремней, Рудни ходят. В Рудне почти всех собак съели.

«Страшно у нас, не приезжайте», — это было первое, что я услышала прошлой зимой от Марины Даниловой в ответ на мое предложение приехать и написать материал. Тогда в Газьбе и правда было неспокойно. Волки устанавливали тут свои порядки. Кто-то видел, как три хищника гнали по деревне лося. Кто-то провожал внука в школу с факелом — запах гари не нравится хищникам. Кто-то включал музыку в гаджетах громче — ее волки тоже не любят. Кто-то развесил вдоль сарая со скотом красные тряпки, чтобы отпугнуть непрошеных лесных гостей. После шести часов вечера на улицу никто не выходил.

Местных детей на маршруте от школы до дома всегда сопровождает один из педагогов.

— Один волк вокруг деревни ходит, — опершись на забор подле своего дома, Марина Данилова непринужденно беседует со мной. — Иногда слышим, как воют где-то недалеко. Но в самой деревне не показываются. Может, потому, что в этом году мы собак много завели. Штук семь-восемь. Все крупных пород. А волки громкого перелая не любят.

В прошлом году по утрам Марина фотографировала свежие волчьи следы камерой мобильного телефона. Сегодня, обойдя утром вокруг дома Даниловых, следов не нашли: волки не приходили. Но я отнюдь не притязала на это. Признаться, даже немного рада, что встреча не состоялась.

— Утром стою на автобусной остановке в Стодолище, жду автобус. Смотрю, а за остановкой — волки. Рыжеватые такие, глаза светятся. Ну не собаки точно, — добавляет свою историю в копилку страшилок о встречах с волками жительница деревни Стодолище Галина Жукова. — Прихожу на работу, рассказываю одной женщине. А она и говорит, что тоже сегодня волков видела. Утром пошла корову доить, а их там шесть или семь стоят на краю леса, высматривают что-то. Та ведро об землю — и скорей в хату.

Кстати, об остановках. Насколько они вообще безопасны? Вокруг леса трасса и больше ничего. Укрыться негде. А сельским детям приходится каждое утро ждать на них автобус. Подхожу к остановке в деревне Межа. В ожидании школьного автобуса, который развезет их по домам, с ноги на ногу переминаются с два десятка школьников — морозно сегодня.

— Как у вас тут с волками? Есть или это все преувеличение? — зябко запахнув полы пальто, с места в карьер начинаю разговор.

Беседа быстро становится общей.

— У нас собаку сожрали у Прохоренко, — дыша на сложенные ладони, говорит мальчик из деревни Степановичи и зачем-то добавляет: — Живьем (будто мне недостаточно страшно. — Авт.).

— А у нас одну собаку в два часа ночи вытащили и съели. Визг стоял, будто свинью режут. Полтела съели и бросили. Вторую собаку не тронули. Теперь на ночь закрываем ее в сарае, — добавляет каплю в море страха еще один школьник.

— Страшно вам тут жить? — не выдерживаю.

— Да в принципе нет. Волки, насколько я знаю, никогда на человека не нападут, — успокаивает меня школьник Григорий Лесков. — Меня несколько раз волк-одиночка до дома провожал. Увязывается и идет следом от остановки до самого дома. Просто так волк не нападет, даже если очень голодный. Вот если поскользнешься и упадешь, ну или сознание потеряешь…

То, что волки часто увязываются следом за одиноким путником, подтверждают и сельские почтальоны, и соцработники: «Метрах в 20—25 держатся, ближе не подходят». У них обход по 6—7 километров, все — по проселочным дорогам… Работа не сахар.

Незаметно за разговорами к остановке подъехал желтый автобус. Пока дети занимают свободные сиденья в салоне, учитель начальных классов ГУ «Межинский детский сад—средняя школа» Любовь Горбачева рассказывает, как организован подвоз детей:

— Утром родители сами приводят детей к остановке. Вечером мы возвращаемся засветло, поэтому не так страшно. Детей на маршруте всегда сопровождает один из педагогов.

Страх потеряли

Хищники почти каждый день напоминают о себе. По словам местных жителей, дикие животные вообще «страх потеряли». По деревням ходят спокойно средь бела дня, никого не боятся. И на глаза попадаются.

— Это было ночью, — показывая на телефоне фото маленького щенка, вспоминает Надежда Кирковец. — Собака просто заскулила. Потом слышу глухой удар. Ну, мысли-то какие? Среди деревни, центральная улица… Ничего плохого не подумала. Только утром поняла, что глухой удар — это звук рвущегося ошейника. Оказалось, дочка калитку не закрыла, и волки спокойно зашли во двор.

— Жуть! — одним словом описал ситуацию старожил деревни Межа Виталий Цевилько. — В этом году нашествие какое-то. Там, за двухэтажками в лесу, мужики ставили капканы. Один волк в них попался. Отгрыз себе лапу и ушел.

На том и расстаемся. Ну, а пока не решится «волчья» проблема, сельчане стараются быть начеку. Особенно в ночное время, когда хищник наиболее активен.

Инна ГОРБАТЕНКО
"Рэспубліка"

ЗДАРЭННЕ

КАЛЯРОВАЕ 8 САКАВІКА

У Гарадку аштрафавалі 50-гадовага дальнабойніка, які 8 сакавіка пафарбаваў грамадзянскую жонку чырвонай тэрмаўстойлівай фарбай для аўтамабіля, піша «СБ Беларусь Сегодня».

45-гадовая жыхарка Гарадка надоўга запомніць гэтае свята: муж узяў балончык з аўтафарбай і пафарбаваў ёй валасы, цела, адзенне.

Зрабіць гэта мужчыну, які працуе дальнабойнікам і вымушаны надоўга пакідаць сям'ю дзеля заробкаў, прымусіла рэўнасць. У міліцыі ён прызнаўся, што палічыў, быццам жанчына яму не верная.

Мужчына ўзяў у рукі балончык з фарбай пасля святочнага застолля. Жонка была і прабачыла, але ўначы ўсё ж такі набрала 102: сужыцель буяніў, пераварнуў увесь дом. Абодва былі нецвярозыя: у мужчыны было больш за 2 праміле алкаголю, у жанчыны - больш за 1,5.

За прычыненую жонцы маральную шкоду мужчына заплаціць штраф - каля 50 рублёў.

"Беларусь Сёння"
Пераклад з расейскай

АХВЯРЫ ПАЖАРАЎ

НА ПАЖАРЫ ЗАГІНУЛА ЖАНЧЫНА

Паводле інфармацыі прэс-службы Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС ў нядзелю 4 сакавіка ў Гарадоцкім раёне на пажары загінула жанчына 1960 года нараджэння.

Паводле інфармацыі прэс-службы 4 сакавіка ў 18-41 паступіла паведамленне аб пажары ў доме ў в. Даўгаполле Даўгапольскага сельсавета Гарадоцкага раёна.

У выніку пажару загінула гаспадыня дома, грамадзянка 1960 г. н.

Прычына пажару высвятляецца.

Т. Гаражанка

СТАГОДДЗЕ БНР

АДМІНІСТРАЦЫЯ ЗВЯРТАЛАСЯ ДА АКАДЭМІІ НАКОНТ РОЛІ БНР

Адміністрацыя прэзідэнта ў год 100-гадовага юбілею абвяшчэння БНР звярнулася ў Акадэмію навук з просьбай падрыхтаваць абгрунтаванне ролі БНР у гісторыі Беларусі: прасіла навукова патлумачыць, што гэта такое і як да гэтага варта ставіцца.

Пра гэтую замову «Нашай Ніве» паведамілі вартыя даверу крыніцы.

Тую выкладку рыхтаваў Інстытут гісторыі Акадэміі навук.

Пазіцыя, сфармуляваная навукоўцамі, даведзена да ідэалагічнага кіраўніцтва краіны, да кіраўнікоў ведамстваў, а далей будзе спушчана па «вертыкалі» ўніз.

Відаць, што амаль ідэнтычныя выказванні міністраў і топ-чыноўнікаў пра БНР і ёсць вынікам знаёмства з той справаздачай гісторыкаў.

Але што канкрэтна яны напісалі?

На жаль, дырэктар Інстытута гісторыі Вячаслаў Даніловіч адмовіўся агучыць дэталі.

«Без каментароў, — сказаў ён. — Ёсць нормы, якія мы мусім выконваць, гэта [быў] непублічны запыт. Але нашай пазіцыі па БНР мы не хаваем».

Даніловіч параіў глянуць раздзел, прысвечаны БНР, у двухтомніку «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці»: «Мы кіруемся пазіцыямі, якія там выкладзеныя, — патлумачыў ён. — Таксама мы яшчэ раз агучым сваё бачанне на канферэнцыіі 15–16 сакавіка ў Акадэміі навук».

Вартапрывесціцытатыаўтараў той кнігі, на якую спасылаецца Даніловіч, каб зразумець, што магло быць у аналітычнай запісцы для чыноўнікаў пра ролю БНР.

«Мы, як гісторыкі, павінны сказаць, што абвяшчэнне БНР — гэта гістарычна абумоўленая падзея.

Факт абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасць яе Рады — гэта была першая спроба не толькі прадэкларацаваць, але і ажыццявіць практычныя захады ўтварэння беларускай дзяржаўнасці, што мае вялікае гістарычнае значэнне. Абвяшчэнне БНР аказала значны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, стала важным крокам далейшага дзяржаватворчага працэсу.

Ад размоў аб фарміраванні беларускай ідэі мы прыйшлі да рэалізацыі гэтых ідэй. Ідэі за дзень не фарміруюцца, а ўзнікаюць дзякуючы таму, што было ўжо напрацавана ў грамадстве. Канец XIX — пачатак XX стагоддзя — час, калі сапраўды ідэя беларускай дзяржаўнасці была сфармулявана і нават зроблена спроба яе рэалізаваць», — казаў пра даследаванне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» колішні дырэктар Інстытута гісторыі Аляксандр Каваленя.

«Мы лічым вельмі важным даводзіць да шырокай грамадскасці погляд на нашу гісторыю з пункту гледжання беларусаў.

Калі мы гэта не будзем рабіць, то можам атрымаць польскі, украінскі, расійскі варыянт нашай гісторыі, а ў нас павінен быць уласны погляд на гістарычныя падзеі, якія адбываліся на нашай тэрыторыі.

Сапраўды, формы ўлады БНР былі зародкавыя. Пры спрыяльных умовах яны маглі пераўтварыцца ў рэальную структуру. Але гэта ні ў якай меры не прымяншае важнасці і значнасці для нашай гісторыі самога факта абвяшчэння (упершыню за тысячагоддзі) права беларусаў на нацыянальнае самавызначэнне», — дадаваў сам Вячаслаў Даніловіч.

«Пытаннедзяржаўнасцівельмі шчыльна звязана з пытаннем існавання асобнага народа. Няма асобнага народа — няма пытання пра асобную дзяржаву, увогуле няма прадмету для размовы. Таму лідары беларускага нацыянальнага руху на пачатку XX стагоддзя займаліся сцвярджэннем гэтага факта ў грамадскай думцы Беларусі і ўвогуле ўсёй Расійскай імперыі: ёсць беларуская нацыя, якая мае свае палітычныя правы і галоўнае — права на ўласную дзяржаву. Галоўнымі асобамі беларускага нацыянальнага руху былі браты Луцкевічы, Іван і Антон, і Вацлаў Іваноўскі», — гэта словы іншага аўтара, кандытата гістарычных навук Андрэя Унучака.

«Да гэтага беларусы не мелі вопыту дзяржаўнага будаўніцтва. Цяпер яны ўзяліся за яго.

У гэтым сіла БНР: у полымі Першай сусветнай вайны беларусы, закасаўшы рукавы, імкнуліся стварыць сваю ўласную дзяржаву. Гарыць зямля, свет гарыць, а тут людзі, на тэрыторыі, падзеленай франтамі, увасабляюць ідэю ў жыццё. Ці ж гэта не гераізм?

БНР — гэта беларуская дзяржава, якую паспрабавалі стварыць дзеячы ў найскладанейшай геапалітычнай сітуацыі ва ўмовах Першай сусветнай вайны, а канкрэтна — у рэаліях Брэсцкага міру 1918 года. Вакол гэтага пытання разгортваліся гарачыя спрэчкі. Адны казалі: так, была беларуская дзяржава, іншыя: не, яна не адбылася. Сёння мы зусім па-іншаму разглядаем гэтыя пытанні.

Мы вядзём гаворку пра тое, што БНР была нацыянальнай формай беларускай дзяржаўнасці.

Гэта стала магчымым дзякуючы таму, што ў калектыўнай манаграфіі „Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст." упершыню ў беларускай гістарыяграфіі распрацавана і рэалізавана новая канцэпцыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці», — словы кандыдата гістарычных навук Мікалая Смяховіча.

Арцём Гарбацэвіч
"Наша Ніва"

У СВЕЦЕ

ВИЦЕ-ПРЕМЬЕР НАЗВАЛ ГЛАВУ РПЦ «СИГАРЕТНЫМ ПАТРИАРХОМ»

Скандал разразился из-за критики патриарха Кирилла в адрес болгарского президента.

Вице-президент Болгарии заявил, что патриарх Московский и всея Руси Кирилл «не является посланником Иисуса Христа» и «известен как сигаретный митрополит», «второразрядный агент советского КГБ».

— Этот человек не спустился с небес, не вышел из Рая и не является посланником Иисуса Христа. Он известен как сигаретный митрополит России. С 1996 года он ввёз на 14 миллиардов долларов безакцизных сигарет и на 4 миллиарда долларов вина для нужд церкви. У него есть частный самолёт и вилла в Швейцарии. Его часы стоят 30 тысяч. Кто он? Это не православный священник. Это агент Михайлов, второразрядный агент советского КГБ. И этот человек имеет наглость судить, — заявил вице-премьер Болгарии Валерий Симеонов 7 марта.

С таким заявлением он выступил после того, как российский патриарх раскритиковал президента Болгарии Румена Радева во время празднования 140-летия независимости и освобождения Болгарии от османского ига.

Кирилл обратил внимание, что произнося торжественную речь, Радев выразил признательность не только русским, но и другим народам Российской империи, воевавшим в составе ее армии: украинцам, белорусам, полякам, румынам, латышам, финнам, сербам и черногорцам.

В ответ патриарх заявил, что Болгарию освободила Россия, а не Польша, Литва или другие страны, и что ему «трудно слышать» об участии других стран в освобождении страны.

— Еще раз вам хочу очень ясно сказать, что Болгарию освободила Россия. Не Польша, не Литва, не другие страны. Хочу откровенно сказать, что для меня трудно было слышать все эти ссылки на участие других стран в освобождении Болгарии. Ни польский сейм, ни литовский сейм не принимали решение о начале войны с османской Турцией. Мы — за историческую правду, господин президент. Мы эту историческую правду завоевали своей кровью, — заявил патриарх Московский и всея Руси.

3 марта Болгария отмечает День освобождения страны от османского ига. В 1878 году по итогам русско-турецкой войны в этот день был подписан Сан-Стефанский мир. Согласно нему, Болгария вышла из состава Османской империи, став независимым государством.

"Салідарнасць"

СТАГНАЦЫЯ

БЕЛАРУСЬ РАЗЬВІВАЕЦЦА АМАЛЬ У ПЯЦЬ РАЗОЎ ПАВОЛЬНЕЙ, ЧЫМ СЬВЕТ

Эканамічная нарада ў Аляксандра Лукашэнкі разьвеяла міты і паказала гаротны стан беларускай эканомікі. Здавалася б, калі такія правалы ва ўсёй гаспадарцы, то трэба рабіць нейкія радыкальныя захады ў палітыцы ці мяняць урад. Але не. Тыя ж самыя людзі будуць рабіць тое ж самае, што і раней. З тымі ж вынікамі. Такое фатальнае беларускае зачараванае кола.

Лукашэнка не зьбіраў падобнай нарады ўжо пяць гадоў. Хоць летась некалькі разоў яна стаяла ў прэзыдэнцкім графіку, але так і не была праведзеная. Бо сам кіраўнік дзяржавы адчувае, што гэткія формы працы з высокім чынавенствам ужо даўно не працуюць. Калі казаць пра ўласна эканамічны бок справы, то чыноўнікі ўжо даўно прызвычаіліся і адаптаваліся да грозных вокрыкаў, загадаў, і ўсё гэта мала ўплывае на рэальныя працэсы ў краіне. І з гледзішча піяру гэта не дае ўжо ранейшага эфэкту. Бо за 24 гады адзін і той жа спэктакль усім надакучыў, нават пры таленавітым акторы ў галоўнай ролі. Таму ўсё ператварылася ў сумны рытуал.

Самы галоўны сюжэт нарады прагучаў у самым пачатку. І ён стаў вельмі адметным. Апошнія гады Лукашэнка ўвесь час тлумачыў праблемы ў беларускай эканоміцы вонкавымі прычынамі. Маўляў, крызіс ва ўсім сьвеце, ад нас мала што залежыць. Нават формулу вывеў: 80% нашых сацыяльна-эканамічных праблем — ад сусьветных катаклізмаў і толькі 20% — ад недапрацовак ураду.

Такой шчырай ацэнкі эканамічнай сытуацыі і самавыкрыцьця з вуснаў Лукашэнкі мы даўно ня чулі. Ён фактычна прызнаў, што шмат гадоў хітраваў, казаў, мякка кажучы, ня тое, што ёсьць насамрэч.

І вось нарэшце настаў момант ісьціны. Такой шчырай ацэнкі эканамічнай сытуацыі і самавыкрыцьця з вуснаў Лукашэнкі мы даўно ня чулі. Ён фактычна прызнаў, што шмат гадоў хітраваў, казаў, мякка кажучы, ня тое, што ёсьць насамрэч. Паводле БелТА, кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што за сем гадоў усясьветны ВУП вырас на 25%, у той жа час рост ВУП Беларусі недацягнуў нават да 6%. Прычыны, якімі ўрад тлумачыць такую сытуацыю — фінансавы крызіс, кань'юнктура — зьяўляюцца проста адгаворкамі. «Калі мы расьцём больш павольна, чым іншыя, значыць, мы адстаём. Адстаём ад сьвету ў развіцці, тэхналёгіях і, вядома, узроўні жыцьця людзей». Гэтае прызнаньне дарагога каштуе. Аказваецца, Беларусь апошнія сем гадоў разьвівалася амаль у пяць разоў павольней, чым увесь сьвет. Гэта ўсё, што трэба ведаць пра беларускую сацыяльную мадэль.

З выступу Лукашэнкі вынікае, што ўсе нібыта дасягненьні ў сацыяльна-эканамічнай сфэры, пра якія кожны дзень апавядаюць дзяржаўныя мэдыя — гэта фікцыя.

Увесь 2017 год афіцыйныя асобы, уключна з самім Лукашэнкам, сьцвердзілі пра «пазытыўную дынаміку» ў эканоміцы, рост валавых паказьнікаў. Але вось паводле сацыялягічных апытаньняў, праведзеных дзяржаўнымі службамі, палова жыхароў краіны лічыць, што летась сацыяльна-эканамічная сытуацыя працягвала пагаршацца, каля 40% апытаных зьмен не заўважылі. Гэта значыць, 90% насельніцтва ва ўпор ня бачаць гэтай «пазытыўнай дынамікі».

З выступу Лукашэнкі вынікае, што ўсе нібыта дасягненьні ў сацыяльна-эканамічнай сфэры, пра якія кожны дзень апавядаюць дзяржаўныя мэдыя — гэта фікцыя.

Дзяржаўныя мэдыя радасна паведамілі, што сярэдні заробак у сьнежні склаў 995 рублёў. То бок фактычна даручэньне Лукашэнкі аб заробку ў 1 тысячу рублёў выкананае. Але сам кіраўнік дзяржавы вельмі скептычна ставіцца да гэтага

(працяг на стар. 4)

СТАГНАЦЫЯ

(пачатак на стар. №3)

«дасягненьня»: «Вы ж літаральна выціснулі з прадпрыемстваў гэтую сярэднюю тысячу ў канцы году. Але дзьве трацiны насельніцтва практычна гэтага заробку ня бачылі. У паловы — ніжэйшы за 650 рублёў. А 10% насельніцтва краіны змаглі зарабіць ня больш за трыста рублёў... Паводле маёй інфармацыі, дасягненьне і ўтрыманьне ў 2018 годзе заробку на ўзроўні тысячы рублёў не пацьвярджае ніводная з абласьцей». Плюс да ўсяго, «закрэдытаванасьць рэальнага сэктару расьце». Значыць, узялі крэдыты, каб выплаціць патрэбны заробак адзін месяц і выканаць заданьне Лукашэнкі.

Яшчэ адна фікцыя. Урад і аблвыканкамы далі справаздачу аб выкананьні пляну ў стварэньні высокапрадукцыйных працоўных месцаў. Насамрэч такіх месцаў — прыкладна 5% ад створаных. «А мясцовыя выканкамы бачаць задачу — трымаць і не звальняць».

Эканамічныя ўлады адрапартавалі аб скарачэньні замежнага доўгу. Лукашэнка канстатуе: дзяржаўны доўг расьце хутчэй, чым эканоміка. «Пагасілі $2,3 млрд, а ўзялі амаль $3,5 млрд».

Падобная сытуацыя з інфляцыяй. Афіцыйна яна склала ў 2017 годзе 4,6%. Лукашэнка абвяргае: «Людзям усё роўна, якая ў нас у краіне сярэдняя інфляцыя. Яны робяць высновы па цэнах на тавары, якія купляюць кожны дзень. А там рост як мінімум на 8-10% за год. А калі паслугі сюды дадаць, то і больш».

Засталося даць адказ на пытаньне: хто ў гэтым вінаваты? Адказ відавочны, і большасьць беларусаў яго ведае.

Меркаваньні, выказаныя ў блогах, перадаюць погляды саміх аўтараў і не абавязкова адлюстроўваюць пазыцыю рэдакцыі.

www.svaboda.org

РАСЕЙСКАЯ ПАПСА

«ТАК НІЗКА, ЯК У КЛІПЕ, БЕЛАРУСАЎ ЯШЧЭ НЕ АПУСКАЛІ»

Меркаванне Рыгора Сітніцы пра нашумелы кліп гурта «Ленінград» з'явілася на сайце саюза.

З вялікай прыкрасцю ды агідай паглядзеў у сеціве відэакліп Вадзіма Галыгіна і гурту «Ленинград», якім гэтыя «прикольные пацаны» павіншавалі жанчын з прыгожым святам. Нават і не прыгадаю, калі яшчэ нас, беларусаў, так нізка апускалі. Алкашы, дэбілы, дэгнраданты, прыдуркі з трасянковай лексікаю алігафрэнаў, якая перакладаецца ў цітрах на «правильный великокультурный язык». І ўся гэтая падвальна-гаражная брыдота суправаджаецца базарна-бардэльным хорам тутэйшых лярваў з прыпевам «хочацца мужыка, лезе ў трусы рука…». А дырыжыруе гэтай гідотай народны, здавалася б, артыст Ярмоленка, а на падпеўках — наша бізнес-women Грыбалёва. Што й казаць, дыхтоўны ўнёсак у творчую біяграфію.

Вось такімі нас, беларусаў, бачаць маскоўскія «шнуры» ды іх тутэйшыя лёкаі, гатовыя за тры панскія капейкі патаптацца па ўласным гонары, якога, падобна, няма, а можа ніколі й не было. Ды каб толькі па ўласным, то й хай сабе, але ж патапталіся яны па нацыянальным гонары кожнага з нас, незалежна ад таго, усведамляе гэта хто, ці не. Баюся, што большасць тутэйшых палічыць гэта проста «классным приколом», прынамсі «tut.by» ды «Наша Ніва» на сваіх старонках у інтэрнеце не прамарудзілі ўслужыць вясёламу «барину».

Спрабую, ды ніяк не выходзіць уявіць, што гэткае нешта Шнур з дапамогаю тамтэйшых «приколистов», зняў бы, скажам, пра літоўцаў, палякаў, латышоў, азербайджанцаў, а тыя хуценька перапампоўвалі б «прикол» на свае старонкі, каб як найболей «лабусаў», «азераў» ды «пшэкаў», пасмакавалі той плявок. Не думаю, што гэткае магчыма. А намі спадарства, як бачым, можна падцерціся, а мы яшчэ і ўсцешыліся: «ах, как прикольно!». Бо ўжо зараз «tut.by» заклікае на канцэрты адэпта расійскага брыдкаслоўя гурта «Ленінград», якія адбудуцца ажно ў кастрычніку. Служым «барину» і прагнем, каб ён наваліў на нас яшчэ болей.

Той, хто дазваляе называць сябе быдлам, відаць, таго й заслугоўвае, а той, хто робіць выгляд, што плявок у вочы — гэта Божая раса, хай пахалопску ўціраецца ды яшчэ й падзякуе за смачны плявок, які, аказваецца, усяго толькі «классный прикол». Ну а тыя, хто гэтыя называе хамствам, а дэманстратыўную абразу — абразай, маюць усе шанцы быць запісанымі ў «колхозники» і «курицы», таму што з-за сваёй цемнаты і тупасці назаўсёды засталіся ў мінулым стагоддзі і не разумеюць вытанчанага гумару. «Ну куды нам да нашых землякоў, прасунутых у маскоўскую гламурную тусню?»

Можна было б паразважаць над прыродай тутэйшага плебейства ды самаапляўвання й заніжанага нацыянальнага імунітэту, але зараз не пра гэта. Зараз мне хацелася б пачуць адпаведнае рэагаванне ад Міністэрства культуры ды Міністэрства інфармацыі нашай краіны. Бо хто, як не яны мусяць дбаць пра вобраз нацыі ў вачах тых, што клянецца ў вечнай любові й братэрстве.

Прыгадалася раптам, як колькі гадоў таму нейкая камісія на чале з М.І. Чаргінцом забараняла канцэрты сусветна знакамітага нямецкага гурта «Rammstein». Во дзе, сапраўды «прикольно».

P.S. Зашмат было б гонару для былых гламурных беларусаў палемізаваць з імі, тым больш даўно ўжо не страшна быць імі залічаным у рэтраграды ды «колхозники», што цалкам пазбаўленыя пачуцця гумару ды самаіроніі. Ну тут справа ў якасці гумару: адна справа — Жванецкі ці, нават нашы Саша і Сірожа, другая — шнуры з галыгінымі. А галоўнае — самы час прыгадаць беларусам, што калісьці наш народ меў да 7% шляхты, жыццёвым прынцыпам і лозунгам якіх быў кліч «Гонар маю!» Жыве Беларусь!

Рыгор Сітніца
belartunion.by

РЭГІЁНЫ

ЛУКАШЕНКО ОЗАБОТИЛСЯ РАССЛОЕНИЕМ РЕГИОНОВ

Что с ними не так? Александр Лукашенко обеспокоился неравномерным развитием белорусских регионов. На эту тему он высказался во время отчета правительства, Национального банка, облисполкомов и Мингорисполкома об итогах работы экономики за прошлый год.

«Нельзя игнорировать те процессы внутри страны, которые уже стали устойчивыми. Я говорю о межрегиональном расслоении», — приводит слова президента его пресс-служба.

В качестве примера неравномерного развития регионов он привел динамику валового регионального продукта за последние годы.

«Развитие есть только у Минской и с большой натяжкой у Гродненской областей. Валовой региональный продукт этих регионов за прошлую пятилетку и два года текущей вырос в Минской на 28% и в Гродненской на 13%. Остальные регионы стагнируют: за 7 лет Брестская область прибавила всего около 5%, Гомель — 3%, Витебская — 2%, а валовой региональный продукт Могилевской области за 7 лет даже сократился», — озвучил цифры Александр Лукашенко.

Разрыв в развитии между регионами хорошо характеризует такой показатель как номинальная начисленная среднемесячная заработная плата.

Если за 2017 год в самых бедных Шарковщинском и Ушачском районах средняя зарплата составила 473,5 и 516,9 рубля, то в самых богатых Солигорском районе и Минске — 1185,9 и 1135,5 рубля, соответственно.

Разница в зарплатах объясняется наличием либо отсутствием крупных производств в регионе. Например, в Солигорском районе работает «Беларуськалий», а в Минске — Парк высоких технологий (ПВТ), где традиционно получают самые высокие зарплаты в стране.

Разрыв между регионами в Беларуси будет увеличиваться и дальше из-за старения населения и миграции в крупные города либо за рубеж, где есть хорошо оплачиваемая работа.

«В регионах нет новых центров роста. У нас как были в первую очередь Солигорск и Минск, так они и остаются. Других центров роста, где бы регион создавал положительные экстерналии для соседствующих регионов, нет», — констатировал научный сотрудник Центра экономических исследований BEROC Олег Мазоль.

На высшем уровне выход из ситуации видят в создании новых предприятий.

«В этих целях наше небогатое государство по крупицам собирает деньги и направляет их в инвестиционные проекты», — сказал во время отчета Александр Лукашенко.

Однако, отметил Олег Мазоль, попытки создания новых рабочих мест в первую очередь ориентированы на конъюнктуру, поэтому не являются эффективными. В качестве примера такого предприятия эксперт привел строительство аккумуляторного завода под Брестом.

«Скорее всего, в долгосрочном плане этот проект будет неэффективен. То есть, такие производства нацелены на текущую конъюнктуру. Разработчики проекта видят, что сейчас есть спрос, а то, что будет через пять лет, их, наверное, не интересует», — отметил экономист.

«А человеческий капитал у нас не безграничен. Просто так заменить людей рабочих профессий не получится. Если привлекать из других стран, то нужно обеспечить более высокую зарплату. Или потратить больше денег на переквалификацию, что создает дополнительную нагрузку на бюджет. А поскольку в регионах нет эффективных производств, то нет спроса на более квалифицированную рабочую силу. Получается замкнутый круг, в результате которого регионы могут остаться без людей в трудоспособном возрасте», — прогнозирует научный сотрудник Центра экономических исследований BEROC.

Это в свою очередь приведет к дальнейшему расслоению и увеличению количества депрессивных регионов.

«У нас сейчас, по сути, исчезают деревни, а дальше будут исчезать и целые районные города», — полагает Олег Мазоль.

По данным исследования BEROC, в сельской местности уровень абсолютной бедности выше, чем в городе. В 2016 году на селе он составил 40,55% населения, в то время как в городе — 25,27% населения. По данным выборочного обследования домашних хозяйств, в четвертом квартале 2017 года за чертой бедности в Беларуси находилось 5,9% населения. В Брестской области — 8,4%, в Минске — 1,6%.

Без реформ изменить ситуацию в регионах невозможно, считает экономист. По его словам, людям нужно дать возможность самим зарабатывать деньги. В регионах — в первую очередь в сельском хозяйстве.

«Не ориентироваться на крупные агропромышленные комплексы, а давать возможность людям выращивать продукцию и создавать другие семейные бизнесы, чтобы люди сами могли себя прокормить и обеспечить развитие своим семьям», — подчеркнул экономист.

"БЕЛАПАН"

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V), Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 16.03.2018 у 19.30 Наклад: 290 асобнікаў. Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў. Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў. Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.